# Аб пазыцыі тав. Чарвякова ў пытаньнях барацьбы з правым ухілам і нацыянал-апартунізмам

З работ пленуму я павінен азнаёміць актыў з пытаньнем пра тав. Чарвякова. Пленум заслухаў інфармацыю Бюро ЦК па даным пытаньні. Гэта інфармацыя ў асноўным зводзілася да наступнага: у той час, калі партыя пад кіраўніцтвам ЦК праводзіла рашучую барацьбу супроць правага ўхілу і нацыянал-дэмакратызму, на радзе актываў Менску, Віцебску, Гомелю на шматлікіх партсходах, члены партыі ў запісках і выступленьнях высоўвалі супроць тав. Чарвякова абвінавачаньне ў тым, што ён ня толькі ня прымае актыўнага ўдзелу ў барацьбе супроць правага ўхілу і нацыянал-дэмакратызму, але і сам рабіў рад апартуністычных памылак.

Бюро ЦК і прэзыдыум ЦКК выклікалі тав. Чарвякова на пасяджэньне, на якім тав. Чарвякоў прызнаў, як усім вядома з апублікаванага ім артыкулу, некаторыя з сваіх памылак. Гэта заява тав. Чарвякова апублікавана, і я ня буду на ёй спыняцца. У часе пленуму ЦК партыі тав. Чарвякоў пад уздзейнасьцю партыйнай думкі і Бюро ЦК партыі прызнаў і рад далейшых сваіх памылак. Рэзалюцыя па даным пытаньні была ўхвалена Бюро ЦК партыі аднагалосна*). Галасавалі ўсе члены Бюро ЦК партыі, у тым ліку і тав. Чарвякоў. Рэзалюцыя ўстанаўляе рад апартуністычных правых поглядаў і ўстановак тав. Чарвякова, якія ў цэлым прадстаўляюць сабою сыстэму права-апартуністычных і нацыянал-дэмакратычных поглядаў. Гэтыя памылкі тав. Чарвякова заключаліся ў тым, што тав. Чарвякоў у адпаведнасьці з лёзунгам Бухарына «обогащайтесь» (у свой час быў кінуты такі лёзунг т. Бухарыным) выступаў і заяўляў, прыкладна, так: «узбагачайцеся, сяляне, здабывайце больш багацьцяў, і, чым багацей будзеш ты, тым багацей будзе наша савецкая гаспадарка». Пасьля апублікаваньня «Записок экономиста» Бухарына тав. Чарвякоў заявіў аб сваёй салідарнасьці з гэтымі запіскамі, якія зусім ясна і зусім нядвузначна былі накіраваны супроць генэральнай лініі партыі. Крыніцу нашых хлебных затрудненьняў тав. Чарвякоў, салідарызуючыся з тав. Бухарыным, бачыў у нашай палітыцы цэн і недаацэньваў ролі і значэньня кулацтва і клясавай барацьбы. Тав. Чарвякоў затушоўваў кіраўнічую ролю прамысловасьці, у некаторых сваіх выступленьнях даваў рад няверных фармулёвак па пытаньнях клясавай барацьбы ў вёсцы, якія сьведчылі аб тым, што ён не разумее ўсёй механікі клясавай барацьбы ў вёсцы і няўхільнасьці яе абвастрэньня зараз, у пэрыяд сацыялістычнай рэканструкцыі.

Тав. Чарвякоў рабіў рад памылак і ў пытаньнях нацыянальнай палітыкі, прадстаўляючы справу так, што камуністычная партыя бальшавікоў Беларусі працягвае справу буржуазных нацыяналістычных партый, якія існавалі да рэвалюцыі, і такім чынам ідэалізаваў гэтыя партыі і групы. Тав. Чарвякоў разам з нацыянал-дэмакратамі рабіў памылкі ў ацэнцы характару Кастрычніцкай рэвалюцыі, падмяняючы пралетарскі характар гэтай рэвалюцыі дробнабуржуазным. Тав Чарвякоў разам з нацыянал-дэмакратамі прыпісваў ролю гегемона ў рэвалюцыйнай барацьбе, у падрыхтоўцы Кастрычніцкай рэвалюцыі інтэлігенцыі. І, нарэшце, тав. Чарвякоў (я пералічыў ня ўсе, спыніўся на больш буйных памылках тав. Чарвякова) яшчэ дапоўніў гэту сэрыю сваіх памылак выступленьнем на XII зьезьдзе КП(б)В з тэорыяй уступак інтэлігенцыі. Ясна, што гэтыя памылкі не выпадковы, не асобныя памылкі. Усім ясна, што чырвонай істужкай цягнуцца гэтыя памылкі на працягу апошніх некалькіх год, прадстаўляючы ў цэлым сыстэму права-апартуністычных і нацыянал-дэмакратычных поглядаў. Тав. Чарвякоў прызнаў гэтыя памылкі, галасаваў за рэзалюцыю Бюро ЦК. Два разы ён прызнаваў свае памылкі. Першы раз у апублікаванай заяве, другі раз, галасуючы за рэзалюцыю з асноўнымі пунктамі, з якімі я вас зараз азнаёміў. Праверка гэтага прызнаньня тав. Чарвяковым яго памылак, перакананьне ў тым, што гэтае прызнаньне непапяровае, можа быць дана толькі ў працэсе практычнай работы тав. Чарвякова, яго ўдзелу ва ўсёй рабоце і ў яго барацьбе супроць правага ўхілу і нацыянал-дэмакратызму.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы